Калі адчыніліся вароты, перад намі паказаўся абшырны дзядзінец. Наўкол хадзілі хадкевічаўскія дружыннікі з выявай Касцешы на грудзях, круціліся дзеці, а пад нагамі дзяўкаў кудлаты сабачка. Насустрач нам ішоў ужо Хадкевіч (значыць, служба ўжо данесла яму пра нас). Высокі, шырокаплечы, з марсавымі, суровымі рысамі твару, характэрнымі для ўсяго роду. Хаця ён не паказваў па сабе, я ведаў, што Аляксандр цешыцца нашай сустрэчай. Такі ён быў заўсёды. Абняліся мы тры разы, і я заўважыў, што ў яго пяцьдзесят чацвёртае лета пасівела яму барада. Вядома, шмат ён пераажыў у апошні час...

Падбегла служба, занялася нашымі коньмі. Пакуль рыхтаваўся пачастунак, гаспадар паказаў нам царкву, якая стаяла пасярэдзіне дзядзінца, тылам да галоўнага ўезду. Збудавалі яе са здаровых дылёў, дах пакрылі гонтай. Двое акаваных дзвярэй былі зачыненыя. На званіцы сонца адбівалася ад трох новых званоў і ад праваслаўнага крыжа. Царкву Яна Багаслова паставіў ён тут у памяць свайго бацькі Івана, што памёр у татарскай няволі. Прывёў сюды манахаў, заснаваў манастыр, пакуль манаская брацыя не паранеслася ў Супрасль. Раней жылі яны тут у навакольных лясах, сыходзіліся штотыдзень на малітву. Цяпер служылі Хадкевічу, двору, дружыне і гарадчанам, пакуль у горадзе не пабудавалі яшчэ адной царквы. Найбольшае свята было тады, калі з'язджала сюды княгіня Алена, жонка караля Аляксандра Ягелончыка, дачка маскоўскага цара Івана Жахлівага (Срогага)і царыцы Ірыны з роду візантыйскіх Палеалогаў...


Фота Лявона Тарасэвіча

Тут, на дарозе да Зарэчан, дзе мост — калісь стаяў млын і валюш (там фільцавалі сукно)

Прыбеглі паведаміць нас, што абед ужо гатовы. Мінаючы агарод, які быў налева зараз за варотамі, падышлі мы да найбольшай хаты, крытай драніцай. Далёка ёй было да рэзідэнцкага двара такога пана, якім быў Хадкевіч; відаць, не пражываў тут шмат часу. Цераз ганак мы ўвайшлі ў сені ля кухні. Адразу пачуўся характэрны, своеасаблівы пах дому, у якім жывуць людзі. За кухняй было відаць камору, поўную рознага кухоннага посуду. За паўраскрытымі дзвярыма на бегунах мы ўбачылі вялікі, пабелены пакой з кафлёвай печкай. Увайшлі туды. Пасярэдзіне пакоя стаяў застаўлены ежай ліпавы стол. Тры вокны напаўнялі памяшканне мяккім святлом. Я падышоў да акна. За частаколам было відаць пераправу на Супраслі, Белявіцкі лес і дарогу ў напрамку Ваўкавыска. Але ж, стол вабіў сваімі пахамі. За абедам павялі мы размову пра ўсё, што адбылося на працягу часу, як мы з Аляксандрам не бачыліся.

Стала цёпла і млява. Перайшлі мы да другога пакоя, з бакоўкай. Тут двое вакон, з італьянскім шклом, выходзілі якраз у бок горада. Я бачыў,

як дарога, па якой мы звярнулі на замак, далей раздзяляецца на дзве і ўтварае трохкутнік. На яго сярэдзіне відаць было шматлікія крамы, вазы ды руплілых людзей. Як у кожны аўторак адбываўся тут мясцовы рынак *(сёння ў гэтым месцы расце гарадоцкі парк)*. Адна з гэтых дарог *(сённяшняя Беластоцкая)* пераходзіла ў пясчаную дарогу Дзернякоўскага лесу, вяла цераз Станок у Заблудаў. Гэтая дарога памятала яшчэ Івана Хадкевіча, які яе перасякаў едучы цераз Блудаў, калі атрымаў гэтыя землі ад караля.

Вярнуліся. Праз сені перайшлі на другі бок хаты, дзе ў чорнай печцы пёкся хлеб, стаялі дзежкі накрытыя льняным палатном — мяшаўся кіслы пах рошчыны і печанага хлеба. За чарговымі дзвярыма была камора на муку. Душна. Гарачыня ад печкі і выпіты намі мёд наводзілі стому. Цягнула выйсці на панадворак. Так мы і зрабілі.

Сонца стаяла яшчэ высока. Ад вады веяла прыемным халадком. Падаліся мы на другі бок дзядзінца, дзе стаяла хата, крытая таксама драніцай, без ганка. Відаць было, што была яна найстарэйшая на гарадзішчы і патрабавала рамонту. У сені ўваходзілася сюды проста з падворка. Была там камора, прызначаная для перахоўвання розных рэчаў. Увайшлі мы ў белы пакой, у якім стаялі ліпавы стол ды зялёная печка з багата аздобленых кафляў. Такія кафлі рэдка дзе можна было ўбачыць — значыць, і раней не жылося тут бедна. Тры шкляныя вокны ўпускалі ў гэты пакой дастатковую колькасць святла.

У трэцяй хаце былі сені, белы пакой з печчу, але толькі з адным ашклёным акном. Да яе сцяны дабудавалі стаеньку — у ёй адпачывалі нашы коні, якіх туды завяла служба. Гэту хату заўсёды давалі гасцям, і мы мелі тут начаваць.

Мы выйшлі на двор. Падаліся ў бок царквы. Тут стаяла высокая драўляная вежа, якая штодзень сцерагла гарадчан перад небяспекай. У ніжняй частцы вежа тая была мураваная, спаўняла ролю скарбніцы. Гэта тут, у адзіным на гарадзішчы мураваным будынку гаспадар у час наездаў ці пажараў хаваў усё найбольш вартаснае. Акаваныя дзверы і жалезная масіўная крата добра хавалі скарбы. А было што сцерагчы! Няшмат часу прайшло, як хранікёр Вялікага княства Літоўскага Мацей Стрыйкоўскі згэтуль узяў два Віцебскія летапісы, каб апісаць гісторыю літоўскіх паноў у Харошчы, дзе зараз і пражывае. А там, угары, у такое сонечнае надвор'е, як сёння, сярод бяскрайніх лясоў, можна было пабачыць Дзернякова на Заблудаўскай дарозе, маёнтак Валілы, станок у Каралеўскім стойле на беразе пушчы, Крыноцкі тракт з Нятупай, дарогу ў Ваўкавыск перасякаючую Белячычы, за возерам Меляшкі, а далёка, далёка там, на поўдні, — той бор, у якім Хадкевіч так часта паляваў.

Мы спусціліся ўніз. Драўляны плот з дылёў паміж царквой, хатай і гумном аддзяляў жыллёвую частку ад гаспадарчай. Мы прайшліся па буйных агародах і апынуліся каля піваварні. Бровар стаяў тут пад адным дахам разам са сладоўняй. У бондах даспяваў ячмень і варылася піва. Недалёка адсюль знаходзілася крыніца, і чыстую ваду бралі непасрэдна з яе. *(Гарэлкі ў той час на нашых землях не ведалі...)*

Побач піваварні стаяў хлеў, дзе карміліі валоў ды свіней. Прыкмецілі мы і той воз з саломай, што ўязджаў разам з намі на замчышча другою дарогай. Якраз падсцілалі валоў і свіней, разыходзіўся ўдушлівы пах свежага гною. Другі хлеў, таксама для парсюкоў, стаяў бліжэй да гарадоцкіх валаў. Тут, пры трох катухах, стаялі два рады буйных коней. Спакойна жавалі сена і толькі час-часам фыркалі ды білі хвастамі, адганяючы надта назойлівых у летні час мух. Аляксандр пахлопаў па шыі гаспадарскага цёмнагнедага каня. Вядома, конь — гонар рыцара! Без каня не даедзеш на каралеўскі двор у Кракаў, ні павоюеш, не папалюеш у Блудаве! *(У той час у полі працавалі толькі валамі)* Мы, выходзячы з канюшні, яшчэ пару раз аглядаліся назад, любаваліся хадкевічаўскімі конямі. А ў вушы ўбіваўся аднастайны лоскат з суседняга будынка.

Гэта ў гумне малацілі збожжа. Наўкол лятаў асцяны пыл, аж цяжка было дыхаць. Тут перахоўвалі зерне да вясны. Збожжа складвалі таксама ў невялікім свіронку, што стаяў паблізу.

Мінаючы гумно, мы яшчэ пераходзілі побач агародаў. Набліжаліся да начлежнай хаты. Сонца хавалася за Дзернякова, цёплым святлом паблісквала на царкоўным крыжы. Перад намі паказаўся дзядзінец. Людзі кудысьці спяшаліся, паветра пацягнула сырасцю ад вады. Кваканне жаб перапляталася з журблівым голасам кнігаўкі з прыбярэжных лазнякоў. Змяркала.

Мы развіталіся з гаспадаром. Сабраліся на спачын у сваю хатку, каб заўтра, калі толькі ападзе раса, падацца ў бок Нарвы. Праязджаць будзем цераз Нязбодку. Кракаў далёка перад намі... •

Тэкст напісаны на аснове інвентара складзенага ў Гарадку ў 1677 г. «Inwentarz Majętności Gródka z Folwarku Mieleszki i Nowa Wola", які знаходзіцца сёння ў Галоўным архіве даўніх актаў у Варшаве, Радзівілаўскі архіў, dz. XXV. S. 1085.

• Перад „Басовішчам”

Фота Лявона Тарасэвіча



Галоўныя арганізатары „Басовішча”: Юрка Сульжык і Дарота Кузьміч (цяпер Сульжык)

Юрка Асеннік

„Басовішча”. Фестываль музыкі маладой Беларусі. Арганізуецца ад сямі гадоў у Гарадку Аб'яднаннем беларускіх студэнтаў (БАС — ад гэтага і назва). Ёсць адзіным і непаўторным не толькі ў межах нашай дзяржавы. Такога няма і ў Рэспубліцы Беларусь. Ад пачатку існавання „Басовішча” пераважаючая колькасць гуртоў прыязджала якраз з-за ўсходняй мяжы. Хаця з кожным годам прыбывае мясцовых гуртоў, якія, каб толькі выступіць на „Басовішчы”, рыхтуюць сваю праграму па-беларуску. З тае прычыны можам мець надзею, што лепшыя гады яшчэ перад ім. Пакуль гэта наступіць, „Басовішча” не ставарае ніякай „пагрозы” для польскай рокавай сцэны. Яшчэ нейкі час гэты фестываль застанецца проста рэгіянальным аглядам непольскамоўнага року. Перш за ўсё ў Гарадку лічаць яго народным фэстам. Такое прынамсі вынікае з выказванняў саміх гарадчан. Вось як жыхары Гарадка ўспрымаюць свой фестываль:

— Ta impreza to jedyna w roku dla tutejszych. Co to za impreza? To z tych Ruskich, te Basowiszcza. Ot, spotkać się, pobawić, może wypić.

— Trochę czasami za głośno. Młodzież taka chamska. Wandalizm taki, że ludzkie pojęcie przechodzi.

— Impreza bardzo fajna, tylko pijaństwa za dużo. Dla miejscowych to święto, bo to przecież wioska, a przez cały rok nic się nie dzieje. Dwa dni jest dla młodych i jeden dla starszych.

— А ну, чакаем „Басовішча”. Тады народу многа, самыя прыезжыя, унукі. Гульня, забавы і танцы.

— Для нашай гміны гэта найбольшае свята. Цэлая сям'я прыедзе, сват, дзеці. Заколем парася. Ой, пагуляем!

— Dla Gródka to już tradycja. Dla starszych odpust, dla młodych czad. Sporo narodu można poznać. Tylko ochrona mogłaby być lepsza, bo nie wiadomo, czego od przyjezdnych można oczekiwać. Różnie to bywało. Za dużo pijaństwa, niektórzy nie umieją się bawić po prostu.

— Для Гарадка гэта свята. Старыя з *коцыкамі*, з торбамі поўнымі закускі ў Барык ідуць, гэта для іх „одпуст”. Для мяне заспакойна, завяскова. Я б хацеў больш „моцнага ўдару”.

Пытаўся я ў выпадковых людзей на вуліцы, у краме, на аўтобусным прыпынку. Ніхто з запытаных не ведаў, хто з'яўляецца галоўным арганізатарам „Басовішча”. Пераважна адказвалі, што, мабыць, Гміна, Дом культуры або Лёнік. Усе пра „Басовішча” гаварывлі як пра сямейнае свята. Таму і мая выснова: усё ж Гарадоцкі фестываль — з'ява больш сацыялагічная, чым музычная падзея. У нядзелю, якую лічаць трэцім днём „Бачовішча”, у гэтым годзе пачуем disco polo. Вясёлай гульні ўсім! •

Фота Лявона Тарасэвіча



...А народ, як заўсёды, прыходзіць у „Барык” шматлюдна, як толькі пачне іграць музыка. Прыносяць з сабой гарэлку, закуску і... унучанят

Z pamiętnika młodej weterynarki


Fot. Leon Tarasewicz

Jadwiga Makal

Zajtki i majtki

Którejś zimy, wczesnym rankiem, kiedy było jeszcze ciemno, obudził mnie stajenny. Ciągnąc za koc, swarliwie mi przygadywał.

— Taż budzi się nareszcie! Człowiek czeka, chce wieźć do porodu.

Stajenny wyszedł, wciąż mi docinając („A ileż to można spać? Celuju nocz i jaszcze na ranku, chto heta baczyŭ?!"). Była siódma rano. Przez okno dyżurki w mroku ujrzałam konia, zaprzężonego do pary sań połączonych na krzyż łańcuchami. Takie „cudo", w którym jechało się po śniegu jakby samym tyłkiem, bo od białej pokrywy oddzielały tylko deski, nazywano tu „statkiem".

Widać było, że gospodarz, w kożuchu, bardzo się niecierpliwił. Wreszcie wszedł do dyżurki i zaczął mnie ponaglać.

— Szybciej! Krowa męczy się już całą noc. Bierzcie torbę i jedziemy. U mnie paśniedajecie!

Włożyłam służbowy kożuch z ogromnym kołnierzem i usadowiłam się na workach z sianem. Miałam uczucie, że siedzę na śniegu. Koń ruszył ostro. Sanki skrzypiały, a cała fura falowała jak tratwa na wodzie. Jechaliśmy na skróty, przez pola. Przed nami wschodziło słońce, które coraz mocniej raziło nam w oczy. W pewnym momencie na drodze pojawiła się duża zaspa. Woźnica w ostatniej chwili pociągną za lejce, próbując ominąć przeszkodę. Na zakręcie koń mocno szarpnął saňmi. Tylna część zaprzęgu z gnojówkami i „podłogą", na której siedzieliśmy, została w śniegu, a koń z „suczką" popędził dalej. Gospodarz natychmiast zeskoczył z fury i pobiegł za koniem. Udało mu się go zatrzymać i przyprowadzić na „miejsce wypadku". Zaczęliśmy składać pojazd do kupy. Koń spokojnie jadł ziarno z półotwartego worka, który jeszcze przed chwilą służył nam za siedzenie.

Och, jaka to była ciężka praca z tą naprawą zaprzęgu! Nie dość, że deski były ciężkie i porozrzucane, to trzeba było się jeszcze śpieszyć, aby zdążyć do krowy. Gospodarz nie miał czasu na zastanawianie się, jak po polsku nazywają się poszczególne elementy fury i denerwował się, gdy zamiast pręta podawałam mu deskę.

— Padajcie tuju luśniu!

— Jaką luśnię? Przecież to kłonica!

— To dajcie kłonicu. Jakija ż wy niepaniatnyja. Skul wy tut uzialisia?!

— Sami mnie tu przywieźliście — rzekłam w końcu zdenerwowana.

— Dobra, dobra... Trymajcie zajtki, kab nie razjechalisia.

— Cooo??? Od moich majtek to trzymajcie się z daleka!

Speszony gospodarz w końcu wyjaśnił, że chodziło mu o płozy. Pozostałe części podawałam mu już bez takich strasznych problemów. Dla lepszego zrozumienia postnowiliśmy uprościć słownictwo. Gospodarz wskazywał palcem i mówił tylko: — Dajcie tuju ch..niu.

W końcu pojechaliśmy dalej. Odetchnęłam z ulgą, gdy zjawiliśmy się w obejściu i mogłam wreszcie zająć się tym, co umiałam. Wyciągnęłam cielaka, który na szczęście urodził się zdrowy.

Od tamtej pory postanowiłam pilnie uczyć się miejscowego języka. Obecnie, po latach, bardzo mi się to przydaje. Sanki teraz mogę składać nawet po ciemku. I to co najmniej w dwóch językach.

Маёлета

Сакрат Яновіч

У часы дзяцінства, якое я памятаю, па хатах вішчала плойма дзяцей. Для сякога-такога парадку быў у дарослых мус шпарыць іх, дзяжыць. Малюты хадзілі пад бацькоўскім страхам, але ўсё роўна ім моцна хацелася есці, расці. У квяцістае лета мы, малыя, усяляк думалі выкруціцца ад спамагання мацярок і таму ахвотна пасвілі свіней на выгане, што за равамі. Маглі там нагуляцца!

Свабода радавала, але не давала хлеба. Выносіць жа з сабою не дазвалялася, бо адбіралі яго нам бандытаватыя замаранікі з Пагулянкі. У такую буйную цяплынь наша хэўра, аднак, зна-

Фота Лявона Тарасэвіча



ходзіла сабе ежу: ласавалі шчавей на лужку Ёзіка Слепака. Гэты распоўзлы гаспадар з тупою галавою меў здольную, блізкую разумнасці карову. Яе не мог упільнаваць нават Пугаўка, патомны пастух. Яна аднаго разу ўцякла з нуднай пашы на наш цікавы выган, калі мы якраз запускалі лятуна (г. зн. паветранага змея). Лятун цяжка ўздымаўся на слабым ветры, яшчэ і злосна перашкаджалі ўстрывожаныя фыркатлівай пачвараю мацёры з пісклявымі парасятамі. Кароўка горш за нас не могучы сцярпець віславухую дурноту, пазаганяла цыцатых у багну разам з раямі іх пацучыных сысуноў... У гэтым замяшанні ўблытаўшыся ў казытлівы ёй шнур, задраўшы хвост паперла з лятуном на рагах у поле; рыхтык алень на цётчынай макатцы.

Пасля тае горкай няўдачы цішком купаючыся ў дрыгвяністай сажалцы Прошапана нехта з нас рассмакаваўся ў салодзістых стаўбунах чагосьці кшталтам аеру... Спрабавалі прытым муціць ваду і лавіць карасёў ды надта ж засмоктвала ногі ў глыбокім муле. Хадзілі — пакінуўшы варту ля свінячага статку — у смуродзіны ў гушчавіннай цемры над крынічнай ручаінаю. Залазіць у агароды не было як, у іх вечна палолі бабы.

Знюхалі чарнаслівы ў каменёўі на даўнім фальварку. Пайшлі латашыць ды з побрахам выскачыў адтуль ліс. Мы ўсё ж не адступіліся і ён знікнуў у зялёнай купе Кашэчай горкі. Калі дапалі да смакоцця, у верхавінах зашасталі чуць не чуваныя звяркі, доўгія і зубастыя. Пярэпалах ад іх застаўся ўва мне на ўсё жыццё! Ногі ўсё роўна што самі неслі нас наўпрасты дахаты...

Не будучы лесунамі, а заполянікамі, не ведалі, што надышлі на вавёрак. ●

● Пазыка

Ліпеньская спякота. У такія нясцерпна гарачыя дні высранскія жулікі думалі толькі пра рэчку. Што ж, думаць можна, але куды ні глянь — да вады будзе некалькі кіламетраў. І хаця пяць вёрст — сабацы не дарога, але ці ж мы сабачкі? Прыдумалі іншае.

На канцы вёскі была складніца. Магутныя грузавікі „Прагі" звозілі сюды з лесу сасновыя і яловыя клёцы і скідалі на горбы. Загарэлы Ванька з Бурчаком пілавалі іх уручную (мая-твая) і акароўвалі. Па гэтыя клёцы штодзень прыязджаў паравозік „цюхця" і па вузкакалейцы адвозіў у тартак у Чарноўсі. Тая ж вузкакалейка спускалася ўніз, праходзіла ля Случанкі, перасякала рэчку па жалезным мосце, недалёка Антонавай хаты. Па гарачай ад сонца кары падпаўзлі мы да аднаго з возікаў і паціху спіхнулі яго ў бок лесу. Калі вагончык набраў хуткасці, мы яго даганілі, ускочылі і... паехалі. Мінулі багно Більдзяў, перасяклі „Чабатароў-



Фота Лявона Тарасэвіча

Лявон Тарасэвіч

ку" і „Загон" (тут прыйшлося выскачыць з возіка і падапхнуць яго пад горку, каб пасля зноў ехаць). Колы ламаталі па рэйках, вецер калоў у вочы. Ужо было відаць рэчку. Але чакаў нас найбольш небяспечны момант падарожжа — Случанская дарога. Маліліся, каб не нарвацца на самаход. Удалося*. Мінулі Случанку, набліжаліся ўжо да моста. Возік імчаўся як вецер. Калі б трапіўся ён нам з тармазом — невялікая бяда, пакруцілі б толькі ручкай, і спыніўся б ён пасярэдзіне моста. А калі возік з драўлянай платформай — трэба з яго нам дзыгаць. Як зайцы, саскочылі мы, даязджаючы да самага моста. Возік папёр як бура, затрымаўся недзе ў лесе. Пра яго лёс мы ўжо не думалі. Раніцай бачылі, як цюхця, едучы з Чорнай, пхала спераду „пазычаны" намі возік. Гэта ўжо было заўтра. А цяпер чакала нас рэчка. ●


* У 1987 годзе сустрэў я ў Гародні Аляксея Карпюка, нашага земляка, пісьменніка. Расказаў ён мне пра сваё дзяцінства. Тадышнія жулікі былі яшчэ больш адважныя. Карпюк расказваў мне, як гуляў у Страшаве з маім бацькам. Калі пераязджаў цягнік з Беластока ў Баранавічы, яны перабягалі рэйкі перад самім паравозам. Перамагаў той, каму ўдавалася перабегчы найбліжэй цягніка.

І сёння бачу такое, што жулікі перабягаюць перад самаходамі. Хаця гэта шалёнае дурацтва, але даказвае яно, што дзеці не мяняюцца.

У цягніку Свінавусце—Варшава, 28 чэрвеня 1996 г.

●Kto jest kim w gminie Gródek

Mirosław Grześ



Fot. Jerzy Sulżyk

Urodził się w 1964 roku w Białymstoku. Mieszka w Pieszczanikach. Do szkoły podstawowej chodził w Załukach, potem uczył się w szkole zawodowej w Michałowie, zdobywając zawód mechanizatora rolnictwa. Jest rolnikiem, pracuje na ponad 17-hektarowym gospodarstwie.

— Moje zainteresowania brały się z tego, czym zajmowałem się w domu. A była to głównie praca na roli.

W Pieszczanikach nie ma właściwie młodych rolników. Wiele osób pracuje w Białymstoku, dokąd codziennie dojeżdża. Niejednokrotnie łączą oni pracę w mieście z gospodarzeniem na wsi.

— Z ziemi nie za bardzo da się utrzymać. Trochę ratują ludzi lasy, z których można czerpać jakieś dochody. Moje gospodarstwo, jak na tutejsze warunki, jest spore, ale i tak nie ma mowy o jakiejś specjalizacji. Przeważa jednak hodowla bydła, do której są tu najlepsze warunki.

W Pieszczanikach i okolicznych wsiach jest coraz mniej ludzi młodych, coraz mniej dzieci.

— Za moich szkolnych czasów w Załukach uczyła się ponad setka dzieci, dziś jest ich dwukrotnie mniej. Bardzo wielu wyjechało do Białegostoku. Przyjeżdżają co jakiś czas do rodziców pomagać w gospodarstwie.

Narzeka na młodzież, która nie potrafi znaleźć sobie odpowiedniej rozrywki, jest mało aktywna.

— Zamiast dbać o swoją świetlicę we wsi, gdzie można się spotkać, regularnie ją demolują, wybijają szyby, niszczą drzwi, instalacje.

Radnym jest pierwszą kadencję. Został wybrany z listy Białoruskiego Komitetu Wyborczego. Jego okręg obejmuje wiele miejscowości — Pieszczaniki, Sofipol, Królowy Most, Przechody. W rodzinnej wsi drugą kadencję jest sołtysem.

— Nie tak łatwo zdecydować się startować na radnego. Na wsi ludzie są mało aktywni, niewiele interesują ich sprawy całej gminy. Świadczy o tym niska frekwencja na wyborach. Zdecydowałem, trochę pod wpływem innych osób, że postaram się reprezentować ludzi z mego terenu we władzach gminy. Jak to wyjdzie, pokaże czas. A problemów jest mnóstwo. Mało jest telefonów, kiepska nawierzchnia dróg. Wodociąg ma być dopiero zakładany...

Okazuje się, że z wodą ludzie już tu sobie poradzili. Pozakładali własne ujęcia, zainstalowali hydrofory. W Pieszczanikach może okazać się, że nie wszyscy będą chcieli skorzystać z wodociągu. To kolejny wydatek, jak niektórzy mówią, niepotrzebny. Pan Mirosław jako radny i sołtys będzie miał tu nie lada problem.

Jerzy Sulżyk

Praca na gospodarstwie nie pozostawia wiele czasu.


— *Po całym dniu pełnym rozmaitych zajęć można co najwyżej obejrzeć wieczorem film, czasem poczytać gazetę (obowiązkowo „gródecką").*

Jest żonaty. Żona Irena pracuje razem na gospodarstwie. Mają dwie córki, w pierwszej i piątej klasie szkoły podstawowej. Znak zodiaku Skorpion. ●

●Łamigłówki

oprac. Edward Wołoszyn

Dzikie ptaki naszej okolicy



Poziomo:

1) gatunek sowy, 4) kogut tego ptaka tokuje, 5) np. gołębiarz, 7) gatunek kaczki, 8) łowca żab, 9) zwana gajówką, 11) z czerwonawym podbrzuszem, 13) chroniony ptak wróblowaty, 14) chętnie buduje gniazda w kominach, 15) jest nią cyranka.

Pionowo:

2) kogut tego ptaka ma lirowaty ogon, 3) znany z klangoru, 6) drapieżnik żyjący nad błotami, 7) np. świerniak, 9) szaro-biały, dygający ptaszek z długim ogonkiem, 10) pospolity szaro-biały ptak, 12) wije wiszące na gałązkach gniazda.



Litery w zaznaczonych kratkach czytane kolumnami utworzą rozwiązanie. *Wśród osób, które do 20 lipca br. nadeślą prawidłowe odpowiedzi (z dołączonym kuponem) rozlosujemy atrakcyjną nagrodę książkową.* ●

● Przyszli na świat, pobrali się, odeszli na zawsze

dane z USC Gródek

Na świat przyszli

Natalia Konończuk, c. Andrzeja i Małgorzaty (Gródek).

Pobrali się

Barbara Muraszkowska (Gródek) i **Krzysztof Grybło** (Dolistowo Stare II) — USC Jaświły, **Anna Adamik** (Gródek) i **Artur Ciszuk** (Białystok) — USC Gródek, **Urszula Topczewska** (Białystok) i **Adam Skowroński** (Gródek) — USC Białystok, **Danuta Siniło** (Białystok) i **Jan Doroszkiewicz** (Mieleszki) — USC Białystok.

Zmarli

Mikołaj Grycuk, l. 67 (Podzałuki), **Mikołaj Kupicz**, l. 37 (Łużany), **Anna Kokieć**, l. 66 (Załuki), **Mikołaj Kupraszewicz**, l. 74 (Stacja Waliły), **Maria Popławska**, l. 99 (Załuki).

Sprostowanie

*W poprzednim numerze w rubryce „Pobrali się" zostały wydrukowane m.in. nazwiska: **Grażyna Podskrobko** (Podozierany) i **Andrzej Matus** (Podozierany) — USC Gródek, zaś w rubryce „Na świat przyszli" — **Ewelina Marta Podskrobko**, c. Andrzeja i Grażyny (Podozierany). Powinno być odpowiednio: **Bożena Podskrobko** (Podozierany) i **Andrzej Matus** (Podozierany) — USC Gródek oraz **Ewelina Marta Podskrobko**, c. Andrzeja i Grażyny (Podozierany).*

Za pomyłkę (USC Gródek przekazał nam błędne dane) serdecznie przepraszamy.

Redakcja

Wiadomości Gródeckie
Haradockija Nawiny

Gazeta o Ziemi Gródeckiej i jej mieszkańcach

Wydają: Rada Gminy w Gródku i Towarzystwo Przyjaciół Ziemi Gródeckiej. Redagują: Jerzy Chmielewski (redaktor naczelny), Jerzy Sulżyk, Leon Tarasewicz, Edward Wołoszyn. Skład i łamanie: Jerzy Chmielewski. Druk: ORTHDRUK, Białystok

Adres redakcji: ul. A. G. Chodkiewiczów 2, 16-040 Gródek.

„Wiadomości Gródeckie" można kupić w Urzędzie Gminy, Domu Kultury, kioskach, sklepach, na poczcie oraz u listonoszy, sołtysów i w lecznicy weterynaryjnej J. Makal & W. Citko s.c. Materiały, listy, uwagi, ogłoszenia i reklamy do „WG" przyjmuje sekretariat Urzędu Gminy.


Numer zamknięto 28 czerwca 1996 r.

Wiadomości Gródeckie
Haradockija Nawiny
Gazeta o Ziemi Gródeckiej i jej mieszkańcach


Kpiny®

Staronka śmiechu i raspusty

godz. 5 07. Mąż nie leń.



godz 5 15. ... i sąsiad nie leń.



Wałodzik

W raju

Bóg zgromadził w raju prawosławnego, katolika i Żyda.

— Dam każdemu z was to, czego zapragnie.

— Ty czego pragniesz? — zwraca się do prawosławnego.

— Sławy.

— Dobrze, będziesz sławny.

— A ty, czego pragniesz? — pyta katolika.

— Całego złota, jakie jest na świecie.

— Bierz je, jest twoje.

— A ty, czego pragniesz? — zwraca się do Żyda.

— Ja? Ja chciałbym znać adres tego katolika.